МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Установа адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка”**

Факультэт беларускай філалогіі і культуры

Кафедра беларускай мовы

Хмель

Валерыя Аляксееўна

# ВОБРАЗНЫЯ СРОДКІ БЕЛАРУСКАЙ КАЛЯНДАРНАЙ ПАЭЗІІ

Дыпломнае даследаванне

***Навуковы кіраўнік*** –
кандыдат філалагічных навук,
дацэнт Фацеева С. І.

Мінск, 2010

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# РЭЗЮМЭ

Хмель Валерыя Аляксееўна. “Вобразныя сродкі беларускай каляндарнай паэзіі”.

Каляндарна-абрадавыя песні, эпітэт, параўнанне, словы-сімвалы, метафарычны вобраз, метафарызацыя, вобразнасць, сімволіка.

Аб’ект даследавання – мова фальклору. Праз аналіз тэкстаў беларускіх каляндарна-абрадавых песень вызначыць і апісаць вобразна-выяўленчыя моўныя сродкі, спецыфіку іх ўжывання, спалучальнасці ў каляндарнай абрадавай паэзіі.

У даследаванні выкарыстоўваюцца апісальны, супастаўляльны, параўнальны і статыстычны метады. З іх дапамогай выяўлены і прааналізаваны эпітэты, іх месца, роля ў каляндарных песнях, акрэслены адметнасці ўжывання параўнанняў у каляндарных песнях, вызначаны і апісаны словы-сімвалы ў тэкстах народных песень, вызначаны асноўныя віды метафары і яе стылістычная роля ў тэкстах народных песень. Даказана, што эпітэт з’яўляецца адным з самых пашыраных сродкаў паэтычна-вобразнага адлюстравання рэчаіснасці ў народнай лірыцы. Паказана, што асноўнай адметнасцю ўжывання параўнанняў з’яўляецца тое, што яны часцей за ўсё маюць устойлівы, традыцыйны характар. Устаноўлена, што сімвал з’яўляецца важным сродкам стварэння вобразнасці, у кожным канкрэтным тэксце мае пэўную семантыку, выконвае неабходную стылістычную функцыю. Пацверджана, што метафара стварае шматмернасць у кантэксце песеннага твора, паказвае на ўзаемасувязі, перадае розныя нюансы семантычных сувязей.

Даследаваны матэрыял можа быць выкарыстаны пры разглядзе пытанняў ужывання вобразна-выяўленчых моўных сродкаў у фальклорных тэкстах, для філалагічнага аналізу тэксту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ